# Каб жыццёвы шлях быў правільны

**На сення ў 14 школах Мінска, Віцебска, Оршы, Магілёва, Гомеля, Жлобіна, Калінкавічаў, Светлагорска, Брэста, Баранавічаў і Лунінца працуюць транспартныя класы. Тут старшакласнікі вывучаюць на паглыбленым узроўні фізіку і матэматыку, а таксама спецыяльныя прадметы, веды па якіх будуць у далейшым карысныя пры навучанні ў розных установах адукацыі па чыгуначных спецыяльнасцях. Другі злёт навучэнцаў транспартных класаў чыгуначнай накіраванасці ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі быў арганізаваны нядаўна ў Гомелі Беларускай чыгункай.**




Яго ўдзельнікамі сталі школьнікі з транспартных класаў з усёй Беларусі, а таксама юныя чыгуначнікі з Мінскай дзіцячай чыгункі імя К. С. Заслонава і навучэнцы чыгуначных каледжаў з Мінска, Брэста, Гомеля і Оршы. Адразу пасля прыбыцця ў горад над Сожам удзельнікі злёту паўдзельнічалі ва ўрачыстай цырымоніі ўводу ў эксплуатацыю на Беларускай чыгунцы новых манеўровых лакаматываў вытворчасці расійскай кампаніі «Бранскі машынабудаўнічы завод». Урачыстае адкрыццё форуму адбылося з удзелам начальніка Беларускай чыгункі Валерыя Вярэніча на базе Гомельскага абласнога грамадска-культурнага цэнтра. Там жа ўзнагародзілі школьнікаў, якія перамаглі ў конкурсах «Гімн транспартных класаў — сімвал адзінства», «Эмблема транспартных класаў», «Талісман злёту транспартных класаў чыгуначнай накіраванасці». Наступным пунктам праграмы было ўскладанне кветак на Алеі Герояў у памяць аб загінулых на гомельскай зямлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Пасля ўдзельнікі злёту наведалі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту і яго філіял — Гомельскі дзяржаўны каледж чыгуначнага транспарту, а таксама Дарожны цэнтр па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў Беларускай чыгункі. На базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту прайшла змястоўная дыялогавая пляцоўка з удзелам начальніка Беларускай чыгункі Валерыя Вярэніча, начальнікаў Гомельскага і Магілеўскага аддзяленняў Сяргея Ярашэвіча і Аляксандра Маісеева. У ходзе размовы хлопцы і дзяўчаты атрымалі змястоўныя адказы на свае пытанні аб перспектывах мадэрнізацыі галіны.

А ў другі і заключны дзень злёту яго ўдзельнікі дэманстравалі здольнасці ў інтэлектуальных і спартыўных гульнях на базе аздараўленчага лагера «Лясныя далі» Гомельскага аддзялення чыгункі. Двухдзённае знаходжанне на маштабным мерапрыемстве дапамагло ім зразумець правільнасць абранага прафесійнага шляху.